Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Збароўскі яслі-сад-базавая школа імя К.Н.Осіпава”

Раённы этап рэспубліканскага конкурса
“Экспанат для музея”
Намінацыя: “Таямніцы ў прадметах”

# “Сякера воіна старажытнай Русі з берага возера Добрае”

Аўтар: Холад Аляксандр Ільіч, 4 клас
Кіраўнік: Чарняўскі Андрэй Іванавіч,
загадчык школьнага музея “Мой родны кут”
Гомельская вобласць, Рагачоўскі раён,
в.Збароў, вул. Савецкая, 53
E-mail: zborov_school@mail.gomel.by
Тэл: 802339 75868

Збароў, 2022

Змест

1. Апісанне музейнай знаходкі……………………………………………………3
2. Гісторыка- культурная даведка…………………………………………….. 7
3. Месца знаходкі……………………………………………………………..9
4. Музейны прадмет і экспазіцыя…………………………………………..…10
5. Культурная вартасць прадмета……………………………………………..11
6. Спісак літаратурных крыніц……………………………………………..12
7. Дадаткі……………………………………………………………………13

1. Апісанне музейнай знаходкі





Ходасавічская сякера, Рагачоўскі раён

Аналогіі музейнага экспаната знойдзеныя ў розных краінах

| | |
|---|---|
| <br><br>Старажытнаруская баявая (універсальная) сякера дамангольскага перыяда. Тып 4 па тыпалогіі А.Н.Кірпічнікава. Знойдзены на тэрыторыі Аргееўскага раёна Малдовы | <br>Старажытнаруская баявая (універсальная) сякера дамангольскага перыяда. Тып 4 па тыпалогіі А.Н.Кірпічнікава. Знойдзены на тэрыторыі Усходняй Украіны |

Баявыя сякеры 10-13 стагоддзяў




Рис. 6. Боевые топоры X—XIII вв. Типологическая схема.

Знойдзеная сякера адпавядае тыпу IV (по А.М. Кірпічнікаву)




Табл. XIII.

*1* — Веськово (64); 2 — Трашковичи (236); *3* — Веськово (99), *4* — Гнездово (122); *5* — Селибка (285 ); *6* — Тяглино (252); *7* — Мохово (313); *8* — Трашковичи (320); 9 — Заславль (473); *10* — Княжа Гора (474).

# 2. Гісторыка- культурная даведка



Малюнак воіна Старажытнай Русі 10-11 ст з сякерай тыпу IV, рэканструкцыя.
Мастак Алег Фёдараў. Магчыма так выглядаў воін з Ходасавічскага паселішча, Рагачоўскага раёна.
Малюнкі Алега Фёдарава заснаваны на сапраўдных археалагічных і навуковых дадзеных, шматлікія з якіх заснаваныя для буйнейшых музеяў і прыватных калекцый Расіі, Украіны і іншых краін.

*З перапіскі савета музея “Мой родны кут” і супрацоўніцы Інстытута гісторыі НАН Беларусі –Вольгі Дрэвіла. Апісанне артэфакта.*

Поліфункцыянальная сякера з шырокім адцягнутым да нізу лязом з бародкай і прафіляваным абухом – тып IV (по А.М. Кірпічнікаву) [1, с.29]. Сякеры гэтага тыпу былі надзвычай папулярнымі – яны складаюць каля 47% ад агульнай колькасці знаходак старажытнарускага часу з тэрыторыі Беларусі. Пры

гэтым, актыўнае выкарыстанне падобных сякер на беларускіх землях фіксуецца ў канцы X–XI ст. Для XII ст. тып ужо не характэрны і üдавочна з’яўляецца архаічным (у іншых рэгіёнах Русі гэты тып быў таксама самым папулярным на працягу X–XI і часткова XII ст.). Цікава адзначыць, што знаходкі сякер тыпу IV канцэнтруюцца ў курганных могільніках уздоўж заходніх межаў Полацкага княства, а таксама на Панямонні ў ваколіцах Навагрудка і на Падняпроўі паміж нізоўямі Бярэзіны і Прыпяці. Акрамя старажытнарускіх земляў сякеры тыпу IV вядомыя ў Латвіі, Літве, Польшчы, Эстоніі, Скандынавіі, Волжскай Булгарыі [2, с.29].

*Из переписки совета музея с Зазулем Сергеем Сергеевичем, российским археологом. Руководил раскопками в археологическом комплексе Гнёздово под городом Смоленском.*

Добрый день!

Это обычный топор типа 4 по Анатолию Николаевичу Кирпичникову. Совершенно классическая форма. Такие топоры на древнерусской территории и территории Беларуси по Николаю Плавинскому и Сергею Каинова появляются в последней четверти 10 века. Характерны для первой половины 11 века.
Судя по удивительной сохранности и полной форме, вполне вероятно, что находка происходит из курганного захоронения. Есть картинки, например, Олега Фёдорова. У него у персонажей, кажется, есть топоры и этого типа.

# 3. Месца знаходкі




Кожны год навучынцы школы, чальцы савета музея аглядаюць помнікі археалогіі ў турыстычных  паходах па маршруце: Збароў-Збароў-1-Збароў-2-Камарына-возера Добрае-Збароўскае гарадзішча. Адзначаюць стан помнікаў, фіксуюць новыя помнікі. І ў адной з вандровак знайшлі цікавы артэфакт-сякеру.

Сякера была знойдзена на дарозе, якая вяла да возера Добрае за чатыры кіламетры ад вёскі Ходасавічы. Тут захавалася больш чым 60 курганаў 11-12 стагоддзяў у двух урочышчах Хорашава і Мошка.

У школьным музеі пачысцілі сякеру, прапраацавалі літаратуру і інтэрнэт, каб знайсці аналагі. Пракансультаваліся  з аспірантам НАН Беларусі Інстытута гісторыі-Вольгай Дрэвіла.

## 4. Музейны прадмет і экспазіцыя

Установа адукацыі з музеем “Мой родны кут” знаходзіцца на ўнікальнай тэрыторыі. У ваколіцах вёскі Збароў, Ходасавічы ёсць помнікі археалогіі розных эпох ад каменнага века да сярэднявечча. У 2000-х гадах, навукоўцы Інстытута гісторыі АН Беларусі прапаноўвалі ў дадзеным мікрарэгіёне зрабіць “Археалагічны запаведнік”. На археалагічных аб’ектах, пачынаючы з канца 19 ст праводзіліся археалагічныя раскопкі. Таксама ў раскопках удзельнічалі і навучэнцы школы разам з настаўнікам.

Большая частка экспазіцыі школьнага музея-археалагічныя артэфакты, якія перадаваліся навукоўцамі пасля раскопак. На Беларусі знайсці прадметы узбраення 10-11 ст, рэдкасць. Сякера Старажытнай Русі, адзін з каштоўнейшых экспанатаў нашага музея. Нам пашансавала, што літаральна за некалькі кіламетраў ад школы знаходзіцца “Збароўскі замак-гарадзішча”. Наведвальнікі музея на свае вочы могуць убачыць гісторыю старажытнасці. Экспанат жалезная сякера, значна дапаўняе як экспазіцыю, так і расказ экскурсавода. Дзякуючы ддзенану прадмету музейная экспазіцыя “ажывае ў часе”, а наша культура ўзбагачаецца новай інфармацыяй

## 5. Культурная вартасць прадмета

Гісторыя сярэднявечча ў Прыдняпроўскім рэгіёне (Рагачоў-Збароў-Ходасавічы) застаецца не папулярызаванай, толькі навукоўцы разумеюць вартасць і ўнікальнасць дадзенага месца. Гэта вельмі турбуе нас, бо турыстычны патэнцыял і гісторыя перыяда ранняга сярэднявечча застаецца белай плямай. На жаль да сёння няма рэканструкцыі Збароўскага замка-гарадзішча 12 ст, цяжка зразумець як жыло насельніцтва замка, чым яно займалася.

Дадзеная работа "Сякера воіна старажытнай Русі з берага возера Добрае" прыадкрывае таямніцы жыцця ваяроў 10-11 стагоддзяў. Экспанат і рэканструкцыя воіна старажытнай Русі паказвае, што ў нас некалі была агульная гісторыя, агульнае развіццё вайсковай справы. Сякеры такога тыпу, як высветлілася былі знойдзеныя ва Украіне, Малдове, Расіі, Латвіі, Літве, Польшчы, Эстоніі, Скандынавіі, Волжскай Булгарыі.

# Спісак літаратурных крыніц

1.Кирпичников, А.Н. Военное дело на Руси XIII–XV вв. л., 1976.

2.Плавінскі, М.А. Узбраенне беларускіх земляў X–XIII стагоддзяў / Мікалай Плавінскі. – Мінск: Галіяфы, 2013. – 106 с. :

ДАДАТАК А

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар дзяржаўнай
установы адукацыі
“Збароўскі яслі-сад-
базавая школа імя
К.Н. Осіпава”
А.В. Клачкова

АКТ прыемкі № ___

“__”______ 20__г, мы ніжэй падпісаўшыеся адказны за музей “Мой родны кут”- Чарняўскі Андрэй Іванавіч і асоба, якая здала музейны прадмет
Майсееў Яўген Міхайлавіч
Склалі цяперашні акт у дзьвух экзэмплярах у тым што, першы прыняў, а другі здаў музею на пастаяннае захоўванне (карыстанне) наступныя прадметы музейнага прызначэння:

| № | Назва прадмета | Захаванасць | Колькасць | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Жалезная сякера | Здавальняюч. | адзін | Экспаз.археал. |
| 2 | | | | |
| 3 | | | | |
| 4 | | | | |
| 5 | | | | |
| 6 | | | | |

Усяго прынята па акту адзін прадмет
Прыняў________А.І.Чарняўскі Здаў_______Я.М.Майсееў

ДАДАТАК Б



| | |
|---|---|
| № ГИК | Тапор стар.Русі |
| № Инв. | |
| Шифр. хран. | |
| | |
| Датировка 10-11 ст. | |
| Материал и техника | |
| Размер | Количество адзін |
| Сохранность здавальняючая, пакрыты іржой | |
| | |
| Откуда, когда поступил и пред. История Знойдзены на дарозе на возера Ходасавічы, Рагачоўскі раён | |
| | |

ОПИСАНИЕ: Поліфункцыянальная сякера з шырокім адцягнутым да нізу лязом з бародкай і прафіляваным абухом – тып IV (по А.М. Кірпічнікаву) [1, с.29]. Сякеры гэтага тыпу былі надзвычай папулярнымі – яны складаюць каля 47% ад агульнай колькасці знаходак старажытнарускага часу з тэрыторыі Беларусі. Пры гэтым, актыўнае выкарыстанне падобных сякер на беларускіх землях фіксуецца ў канцы X–XI ст. Для XII ст. тып ужо не характэрны і відавочна з'яўляецца архаічным (у іншых рэгіёнах Русі гэты тып быў таксама самым папулярным на працягу X–XI і часткова XII ст.). Цікава адзначыць, што знаходкі сякер тыпу IV канцэнтруюцца ў курганных могільніках уздоўж заходніх межаў Полацкага княства, а таксама на Панямонні ў ваколіцах Навагрудка і на Падняпроўі паміж нізоўямі Бярэзіны і Прыпяці. Акрамя старажытнарускіх земляў сякеры тыпу IV вядомыя ў Латвіі, Літве, Польшчы, Эстоніі, Скандынавіі, Волжскай Булгарыі

Примечания: захоўваецца ў экспазіцыі “Археалогія”

ДАДАТАК В



ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
“ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ”

**Дырэкцыя Інстытута гісторыі НАН Беларусі**
**аб’яўляе**

# ПАДЗЯКУ

Вучню 5 класа Дзяржаўнай установы адукацыі
“Збароўская сярэдняя школа”

*Маісеяву Яўгену Міхайлавічу*

**за актыўную працу па вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны Рагачоўшчыны**

**Дырэктар**
**Інстытута гісторыі НАН Беларусі** **В.В. Даніловіч**